Адкрыццё выстаўкі «Жамчужыны Усходу» запланавана 15 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Выстаўка прымеркавана да святкавання Новага года па ўсходнім календары і арганізавана сумесна з Рэспубліканскім інстытутам кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ, Інстытутам Канфуцыя МДЛУ, Маскоўскім клубам аматараў кітайскага жывапісу гунбі, а таксама аўтарамі з Беларусі і Паднябеснай. У экспазіцыі — работы, выкананыя ў старажытных тэхніках (сі-і, гунбі, магуфа, карэйскі жывапіс мінхва, мастацтва каліграфіі), і іх творчае пераасэнсаванне сучаснікамі. Пазнаёміцца з экспазіцыяй можна будзе да 6 мая.